# Пра гены, карані і дзеясловы

## Агульны педагагічны стаж дынастыі настаўнікаў Саковічаў – Касценічаў – Прахарэвічаў складае 1000 гадоў

**Усе мы хочам, каб нашы дзеці, унукі, праўнукі знайшлі сваё месца ў грамадстве – былі адукаванымі, сумленнымі, стварылі моцныя сем'і ды не забываліся пра бацькоў і дзядоў, пра месца, дзе нарадзіліся, вучыліся, раслі… Такі вынік, вядома, у большай ступені залежыць ад нас саміх. Але не менш важнае значэнне для станаўлення любога хлопчыка і дзяўчынкі мае атмасфера, створаная вакол яго ў перыяд першых крокаў да пазнання свету. І тут ужо справа за настаўнікам, яе «канструктарам». Пра ўнікальнага чалавека з гэтай кагорты наш расказ…**

### Дайсці да прафесіі

Паважаны чалавек. Так звычайна ў вёсцы кажуць пра таго, хто на працягу свайго жыцця заслужыў пашану за сваю працу, узорныя паводзіны, добразычлівыя адносіны да людзей. У вёсцы Вяляцічы Барысаўскага раёна такой паважанай асобай, безумоўна, з'яўляецца Дзмітрый Аляксандравіч Касценіч. Ён – Настаўнік з вялікай літары, педагог па прызванні. І хоць ажно 38 гадоў быў дырэктарам мясцовай дзесяцігодкі, загружанасць адміністрацыйнымі справамі ніколі не перашкаджала яму шчыра і самааддана выконваць настаўніцкія абавязкі. Гэта і прынесла Дзмітрыю Аляксандравічу павагу вучняў і бацькоў.

Калі пытаешся ў Касценіча, што прывяло яго да прафесіі настаўніка, упэўнена адказвае:

– Кнігі! – а затым дадае: – І гены.

Сапраўды, паслухаўшы расказ Дзмітрыя Аляксандравіча, прыходзіш да высновы, што менавіта гэтыя два фактары паклалі пачатак напісанню цікавай кнігі яго лёсу.

Час нараджэння Дзімы Касценіча, 1944 год, быў пазначаны адначасова радаснымі і сумнымі падзеямі. Радаснымі, таму што з родных мясцін прагналі немцаў, сумнымі – у баях з імі загінуў бацька і на маці цяжкім грузам лягла доля ўдавы.

Як і ўсе дзеці таго пасляваеннага пакалення, Дзмітрый уволю паспытаў нішчымніцы. Але разам з клопатамі пра хлеб надзённы хапала ў яго часу і на тое, каб пачытаць кнігу. Ды кнігу не простую, а самую што ні ёсць унікальную! Пра яе расказ наперадзе. Спачатку трэба патлумачыць, што маці Дзмітрыя, Настасся Захараўна, была з роду Саковічаў. Яе дзед Рыгор Раманавіч Саковіч працаваў вясковым настаўнікам на Магілёўшчыне яшчэ ў 1860-я гады. Ён быў чалавекам вельмі адукаваным, меў аўтарытэт сярод вяскоўцаў, у хаце Саковічаў збіраліся цэлыя сем'і, каб паслухаць пра тое, што адбываецца ў свеце. З яго вялікай бібліятэкі маці Дзмітрыя Касценіча і засталося ў спадчыну тое «Евангалле» на стараславянскай мове, якое стала для хлопца першай кнігай у жыцці. Затым былі іншыя кнігі, якія зачароўвалі вясковага хлопца прыгодамі, таямніцамі і новымі ведамі.

З успамінаў маці ведаў Дзмітрый і пра свайго дзеда – Несцера Рыгоравіча Саковіча, які настаўнічаў у вёсцы Новыя Пранічкі Магілёўскай губерні.




◀ Д.А. Касценіч расказвае вучням пра сваю настаўніцкую дынастыю

А яшчэ ён удзельнічаў у Першай сусветнай вайне і праявіў сябе храбрым афіцэрам, за што быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам. Пазней у сваім дзённіку Дзмітрый Касценіч напіша: «У маім архіве захоўваецца фотаздымак Дзядулі – Саковіча Несцера, Георгіеўскага кавалера… Мяне ўразіў яго каліграфічны почырк… Дзядуля напісаў 100 гадоў таму, і кожная літара як быццам бы вылітая з металу. А яшчэ Дзядуля ў сваім кароткім пісьме напісаў словы Бацька, Маці, Браты, Сёстры з вялікай літары. І я па прыкладу свайго Дзядулі-Настаўніка пішу частку слоў не па правілах арфаграфіі, а з вялікай літары – Настаўнік, Маці, Браты, Сёстры».

Усё гэта, вядома, уплывала на характар Дзмітрыя і дало штуршок для выбару будучай прафесіі. Аднак аднаго жадання стаць настаўнікам, як яго дзед і прадзед, аказалася недастаткова. Справа ў тым, што ў тыя часы для паступлення ў навучальную ўстанову патрэбна была даведка з калгаса, што гаспадарка не супраць адпусціць свайго працаўніка. Але кіраўнік калгаса чамусьці заўпарціўся, і Дзмітрыю давялося пайсці на хітрасць. Каб атрымаць патрэбны дазвол, ён сказаў, што паступае ў сельскагаспадарчую навучальную ўстанову. Яшчэ і дагэтуль, расказваючы пра той выпадак, Дзмітрый Аляксандравіч неяк саромеецца, што давялося пайсці на падман. Затое была радасць, калі ўбачыў сваё прозвішча сярод студэнтаў Мінскага педагагічнага інстытута. Гады вучобы праляцелі хутка, і неўзабаве ён атрымаў дыплом.

## Пакахаць настаўніка

Дзмітрый Аляксандравіч перакананы, што каханне з першага погляду – гэта не выдумка.

– Што наканавана лёсам, таго не абмінеш, – разважае ён. – Гэта толькі на першы погляд здаецца, што нейкая падзея здараецца з табой выпадкова. Успамінаю, як аднойчы ў кабінеце фізікі, хоць я і быў моцна заняты, мне раптам захацелася паглядзець у акно. Там на школьным прысядзібным участку прыкмеціў сярод школьнікаў жвавую дзяўчыну, вельмі ж спрытную і ўвішную. Спачатку падумаў, што вучаніца, але заўважыў, як яна дае парады, нешта паказвае дзецям, і зразумеў: гэта настаўніца. Той мой позірк стаў лёсавызначальным…

Было гэта ў 1967 годзе, калі маладога настаўніка фізікі Дзмітрыя Касценіча

накіравалі на працу ў Забашавіцкую сярэднюю школу Барысаўскага раёна. Туды ж пасля педагагічнага вучылішча прызначылі настаўніцай пачатковых класаў Тамару Прахарэвіч. Ёй было крыху больш за сямнаццаць гадоў. Прыгожая, сціплая і працавітая, яна спадабалася не толькі Дзмітрыю. Вока на яе таксама паклаў настаўнік фізкультуры і… нават адзін з вучняў старшых класаў.

– Гэта была сур'ёзная канкурэнцыя, – прызнаецца Дзмітрый Аляксандравіч. – Хаця фізкультурнік быў хлопец высокі, здатны, але і мяне ростам Бог не абдзяліў. Ужо зараз можна прызнацца, што на глебе кахання да Тамары паміж намі адбылася сапраўдная бойка. На шчасце, перамог я… Гэты выпадак застаўся толькі паміж намі: разумееце, што здарылася б, калі б даведаліся пра такое высвятленне адносін паміж настаўнікамі?

А вось з закаханым у настаўніцу вучнем, паводле слоў Дзмітрыя Аляксандравіча, было больш складана:

– Аднойчы мы з ім амаль паўночы блукалі па вёсцы, і я, на правах старэйшага, тлумачыў вучню, што яму яшчэ рана думаць аб «сямейных» справах, і пераканаў, – узгадвае тыя далёкія часы мой суразмоўца.

Тамарыны бацькі, Павел Макаравіч Прахарэвіч і яго жонка Кацярына Трафімаўна, таксама былі настаўнікамі. Абодва аддалі школе па 45 гадоў жыцця. Так пасля рэгістрацыі шлюбу Дзмітрыя Касценіча і Тамары Прахарэвіч аб'ядналіся дзве выдатныя педагагічныя дынастыі.

Сёлета сям'я настаўнікаў Касценічаў адзначыла залатое вяселле. У Дзмітрыя і Тамары двое дзяцей і чацвёра ўнукаў. Мой суразмоўца прызнаецца, што амаль усё сваё працоўнае жыццё быў моцна заняты дырэктарскімі справамі. Кіраўніком Вяляціцкай школы маладога перспектыўнага настаўніка прызначылі ў 24 гады, і прабыў ён на гэтай пасадзе аж да 62. Зразумела, больш клопатаў аб дзецях даставалася Тамары Паўлаўне. Тым не менш, як лічыць галава педагагічнага клана Касценічаў, дачка і сын выраслі годнымі сваіх шаноўных продкаў.

– Мы ў сям'і паводзілі сябе так, каб паказваць прыклад дзецям, – кажа Дзмітрый Аляксандравіч. – Лічу, што гэта самы дзейсны сродак выхавання.

Дзеці ўслед за бацькамі таксама атрымалі настаўніцкую адукацыю. Сын Андрэй, адслужыўшы на Поўначы на атамнай падводнай лодцы, доўгі час дапамагаў бацьку пісаць відэалетапіс Вяляціцкай сярэдняй школы. Дачка Вольга стала выкладчыцай беларускай і польскай моў, працавала ў адной са школ горада Барысава. У сям'і Касценічаў вельмі даражаць сустрэчамі з былымі навучэнцамі. Сапраўднае свята, калі ў дом прыходзяць людзі, якіх Дзмітрый Аляксандравіч і Тамара Паўлаўна калісьці вучылі. І тады гэтая сям'я павялічваецца ў шмат разоў.

Некалькі гадоў таму на дзень нараджэння Дзмітрыю Аляксандравічу падарылі прыгожы насценны гадзіннік.

– Мы дамовіліся, што я буду жыць да таго дня, пакуль ідзе гэты гадзіннік, – ці то жартам, ці то ўсур'ёз гаворыць Дзмітрый Аляксандравіч. – Аднак яго ўжо рамантавалі. Як і мяне...

Не так даўно Касценічу-старэйшаму зрабілі аперацыю на сэрцы, і цяпер ён жыве з кардыястымулятарам. Але жвавасці не пазычаць. Раней трымаў карову, каня, парсюкоў. Цяпер апрацоўвае зямлю, яшчэ займаецца пчоламі. Дзмітрый Аляксандравіч перакананы: жыць у вёсцы і не мець хатняй гаспадаркі – гэта няправільна.

## Пабудаваць школу

Вяляціцкая сярэдняя школа – «ветэран» сярод устаноў адукацыі Барысаўскага раёна. Сёлета ёй споўнілася 173 гады. У 1845 годзе гэта быў невялікі драўляны будынак земскай школы. У 1939-м пабудавалі новы. Але з цягам часу і ў ім стала цесна – у канцы 1970-х гадоў там атрымлівалі веды каля 800 вучняў. Колькасць іх штогод расла, і хутка заняткі мусілі праводзіць аж у тры змены. Дырэктарам якраз быў Дзмітрый Касценіч. І каб з'явіўся новы, больш прасторны будынак, яму давялося прыкласці шмат намаганняў.



Заслужаны настаўнік Беларусі Дзмітрый Аляксандравіч Касценіч




Рабочае месца Д.А. Касценіча ў школьным музеі

– Давялося нават пісаць Брэжневу, – узгадвае Дзмітрый Аляксандравіч. – Але ўсё вырашылася, калі падключылі «цяжкую артылерыю» ў Мінску, я маю на ўвазе зварот з просьбамі да вядомых у рэспубліцы людзей. Нарэшце справа з месца зрушылася: прыехалі спецыялісты вывучыць месца будучага будынка. І раптам кажуць, што будаваць нельга, быццам бы грунт няўстойлівы, маўляў, патрэбны надзвычай моцны цэмент, як на касмадроме Байканур. Пытанне будаўніцтва пайшло па новым вітку. Але наступная камісія пасля праверкі дала станоўчае заключэнне і дазволіла ўзвесці трохпавярховы школьны будынак…

## «Дакапацца» да цікавага

Касценіч – чалавек няўрымслівы, заўжды ў пошуку цікавых фактаў і ідэй, якія могуць дапамагчы ў вучэбным і выхаваўчым працэсе. Шмат часу ён аддаў, каб даведацца пра ўсе сакрэты вёскі Вяляцічы, якімі цяпер дзеліцца са сваімі вучнямі.

Прынята лічыць, што назва вёскі ўтворана ад назвы старажытнага племені велеты, якое калісьці жыло ў гэтых мясцінах. Аб даўнім пасяленні людзей у краі сведчаць шматлікія знаходкі рэчаў каменнага веку. Яшчэ з XIX стагоддзя даследчыкам вядома старажытнае гарадзішча ў Вяляцічах. Яно знаходзілася недалёка ад месца ўпадзення Начы ў Бобр і датуецца VI–X стагоддзямі. У 1916 годзе ў Вяляцічах была знойдзена старажытная каменная сякера. Пазней ва ўрочышчы каля вёскі знаходзілі крамянёвыя прылады працы. А ў 1954 годзе ў кар'еры на левым беразе Начы было выяўлена самае старое з вядомых на Барысаўшчыне пахаванняў: яно датуецца X–XI стагоддзямі. Акрамя непасрэдна пахавання, там выяўлены сякера ў выглядзе ладдзі з грыбападобным абухом і дзве крамянёвыя вузкаабушныя сякеры.

Сведкамі больш позніх часоў знаходжання на гэтых землях людзей з'яўляюцца курганы (ці інакш – валатоўкі, капцы), размешчаныя ва ўрочышчы Валатковае поле. Выяўлены яны ў 1924 годзе. На той момант адзначана цэлая група курганоў. У 1979 годзе іх было толькі 13. Зараз засталіся адзінкі.

Гісторыю малой радзімы добра ведаюць вучні Вяляціцкай школы. Дарэчы, актыўныя члены гуртка «Мы нарадзіліся пад адной зоркай» Алёна Дышлевіч, Настасся Лукашэвіч і Станіслаў Дуброўскі правялі для нас цікавую экскурсію па роднай установе. На думку Дзмітрыя Аляксандравіча, настаўнік у сваёй працы павінен выкарыстоўваць пастаяннае імкненне дзяцей да таямнічага, невядомага. І таму Касценіч вышуквае для гэтага розныя цікавыя факты і асаблівасці мясцовасці, дзе вучні жывуць. Так, на Валатковым полі, дзе рэчка Нача ўпадае ў Бобр, ёсць велізарны, быццам скала, камень. Людзі яго называюць Вялят-каменем.

Настаўнік разгледзеў на ім з аднаго боку выяву чалавека-волата, а з другога – нібыта праваслаўны крыж. Не аднаму пакаленню вучняў паказваў ён гэтыя выявы. Летась вучоныя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта зрабілі выснову, што гэты аграмадны валун можа стаць экалагічным помнікам мясцовага значэння.

Або вось яшчэ адна гісторыя, якая заўсёды выклікае цікавасць у дзяцей. Як вядома, адступаючы ў 1812 годзе, Напалеон шмат нарабаваў дабра. Існуе легенда, што французская армія пакінула гэты скарб недалёка ад сутокаў Начы і Бабра, а мясцовых жыхароў, якія дапамагалі схаваць нарабаванае, забралі ў палон у Францыю. Дзмітрый Аляксандравіч таксама вырашыў гэтым пытаннем заняцца. Аднойчы ад былога дырэктара Вяляціцкага дзіцячага дома Дзмітрыя Чыстап'янава ён пачуў незвычайны расказ, які падрабязна запісаў і потым нярэдка выкарыстоўваў у рабоце з вучнямі, каб актывізаваць у іх цікавасць да мінулага. Дык вось, Чыстап'янаў паведаміў яму, што аднойчы з групай выхаванцаў накіраваўся ў паход па ваколіцах Вяляціч. Спыніліся на начлег на Валатковым полі. Калі ўвечары развялі вогнішча і гатавалі вячэру, да іх нечакана падышла бабуля і звярнулася да дырэктара са словамі: «Я хачу расказаць вам нешта важнае». Адвёўшы яго даволі далёка ўбок, яна сказала: «Мне ўжо амаль сто гадоў, хутка Бог пакліча да сябе, і я не хачу несці ў магілу тайну, якую даверыў мне мой дзед Іллюшонак Максім». Далей бабуля паведаміла, што дзед пачуў тайну ад свайго дзядзькі Апанаса, які недзе згінуў, калі адступалі напалеонаўскія войскі. Аднойчы на кірмашы ў Кіеве да Максіма падышоў сівы мужчына і кажа: «Спадар, прабачце, але Вы вельмі падобны на майго брата з Вяляціч, што ў Беларусі». Завязалася гутарка, у ходзе якой Максім даведаўся: перад ім той самы Апанас. Дзядзька расказаў, што яго забралі з сабой французы пасля таго, як дапамагаў ім закопваць нейкае дабро. «Знайдзі яго і пабудуй у Вяляцічах царкву. Дабро закапана ў лесе, на тым баку ракі Бобр. Рака, як і чалавек, умее хаваць тайну...» – сказаў Апанас.

Пасля гэтага аповеду бабуля знікла ў начной цемры, а праз тыдзень Дзмітрый Чыстап'янаў даведаўся, што памерла амаль стагадовая мясцовая жыхарка Марыя Іллюшонак. Жанчыну часта бачылі на беразе ракі Бобр, яна быццам штосьці шукала там...

## Быць шчаслівым

Дзмітрый Аляксандравіч лічыць сябе шчаслівым чалавекам:

– Усе людзі нашага роду – настаўнікі, сяляне, рабочыя, воіны былі і застаюцца дастойнымі грамадзянамі сваёй Радзімы. У гэтым наша шчасце. І я шчаслівы таму, што ўсё жыццё прысвяціў навучанню і выхаванню дзяцей і стварыў самабытную школу, якую ведаюць не толькі ў Беларусі. Шчасце – гэта жыццё і праца. Настаўнік шчаслівы, калі вучні абганяюць яго ў прафесіяналізме. А яшчэ я шчаслівы таму, што яны мне давяраюць самыя патаемныя думкі.

Апошні тэзіс шчасця паводле Касценіча варта растлумачыць на канкрэтным прыкладзе. У сваім дзённіку ён апісвае вось такую гісторыю: «Некалькі дзён таму я вярнуў у школу вучня 10 «Б» класа... Хлопец тры месяцы не хадзіў на ўрокі. Класны кіраўнік, сацыяльны педагог, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце наведвалі сям'ю, гутарылі з бацькамі юнака, але безвынікова. Затым да гэтых гутарак падключыліся члены бацькоўскага камітэта, старшыня прафкама і дырэктар саўгаса, інспектар па справах непаўналетніх, старшыня сельскага Савета. Да яго накіроўвалі аднакласнікаў. Але юнак закрыўся ў сабе і ў школу не ішоў. Звярнуліся да мяне, хаця я ўжо дырэктарам не працаваў. Чатыры дні я наведваў сям'ю юнака, гутарыў з бацькамі, братам, сястрой, самім Аляксеем. Расказаў яму пра яго дзеда Сяргея Харытонавіча, які ўсё жыццё працаваў трактарыстам і меў урадавыя ўзнагароды. А таксама пра прадзеда, кавалерыста чапаеўскай дывізіі, удзельніка фінскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Аляксей, на жаль, аб гэтым не ведаў. І ён раптам адкрыў сваю душу, расказаў, што






▲ У Вяляціцкай школе свята захоўваюць памяць пра Героя Савецкага Саюза Алену Колесаву

◀ Вахта памяці ў гонар Алены Колесавай

марыць стаць будаўніком. Але… у школу хадзіць адмовіўся. І ўсё ж праз нейкі час прыйшоў. Мы разам пайшлі ў Музей народнай славы, дзе былі сабраны дакументы пра яго дзеда і прадзеда. І юнака быццам падмянілі. Ён стаў маім першым памочнікам у музейнай справе і нядрэнным вучнем».

## Выхаваць патрыётаў

У працы настаўніка не трэба цурацца таго памятнага і каштоўнага, чым напоўнена родная беларуская зямля. У гэтым Дзмітрый Аляксандравіч перакананы.

– Вяляцічы – край гераічны, – тлумачыць свой падыход Касценіч. – Тут вяліся баявыя дзеянні ў гады Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, у час акупацыі дзейнічалі партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі. 267 загінулых мясцовых жыхароў – такую даніну забрала Вялікая Айчынная. Пра 130 чалавек не было ніякіх звестак. Але нам з вучнямі ўжо ўдалося даведацца пра лёсы 12 з іх. Дэвіз нашай школы – «Хто не ведае мінулага, той губляе будучае». І на гэтым мы таксама выхоўваем вучняў.

Яскравы прыклад такога выхавання – дзейнасць школьнага клуба «Пошук». Яго ўдзельнікаў аднойчы зацікавіў фотаздымак медальёна салдата, які загінуў у 1942 годзе пад Ржэвам. Там захаваліся толькі ініцыялы – Ф.К., таксама былі звесткі аб месцы нараджэння і прызыву ў армію. Вучні з дапамогай настаўнікаў правялі складаную пошукавую працу, якая прынесла плён. Высветлілася, што медальён належаў Піліпу Колесеню. Як затым стала вядома, у сям'і мясцовага жыхара Аляксея Колесеня было шасцёра дзяцей. Вайна забрала ўсіх сыноў – Міхаіл загінуў на фронце, Рыгора фашысты расстралялі за сувязь з партызанамі, а пра Піліпа ніякіх звестак не было. І вось нарэшце трагічны прабел быў ліквідаваны школьнікамі.

А яшчэ ў Вяляціцкім краі вельмі даражаць тым, што ў гэтых мясцінах здзейсніла свой подзвіг маскоўская піянерважатая Герой Савецкага Саюза Алена Колесава. У ноч перад 1 мая 1942 года дыверсійная група дзяўчат пад яе кіраўніцтвам была скінута на парашутах у лясы Барысаўскага раёна. Савецкі дэсант наводзіў жах на фашыстаў. Асабліва яны баяліся Алёшкуатамана, або Лёльку, – так мясцовыя жыхары назвалі Лену Колесаву, якая заўсёды хадзіла на заданні з ордэнам Чырвонага Сцяга. Вось такія аб'явы вывешвалі немцы па вёсках: «За дапамогу злавіць здараненную бабу атамана – дэсантніцу Лёльку даецца ўзнагароджанне 30 000 марак, 2 каровы і літр гарэлкі».

У Вяляціцкай сярэдняй школе свята берагуць памяць аб гэтай гераічнай дзяўчыне. Яе імем названа піянерская дружына, у Музеі народнай славы ёсць спецыяльны раздзел, прысвечаны

Алене Колесавай. Але галоўнае, што практычна кожны вучань можа падрабязна расказаць пра яе гераізм у цяжкія ваенныя гады. Відавочна, так выхоўваецца сапраўдны патрыятызм.

## Напісаць характарыстыку

Генеалагічнае дрэва Саковічаў – Касценічаў – Прахарэвічаў, якое стварыў Дзмітрый Аляксандравіч, не зусім звычайнае. На вялізным ватмане абазначаны лёсы ўсіх 28 чалавек, якія займаліся або займаюцца педагагічнай дзейнасцю. Агульны стаж дынастыі настаўнікаў – Саковічаў (галіна ад маці Дзмітрыя Аляксандравіча), Касценічаў (ён і яго родныя) і Прахарэвічаў (лінія жонкі) – 1000 гадоў! Мой суразмоўца ганарыцца тым, што правёў такую велізарную работу і цяпер наступныя пакаленні сям'і будуць ведаць гісторыю свайго роду.

Але мяне больш уразіла зусім іншая праца гэтага няўрымслівага педагога. На працягу 38 гадоў, што Дзмітрый Аляксандравіч Касценіч быў дырэктарам Вяляціцкай сярэдняй школы, столькі ж адбылося выпускаў. І кожнаму выпускніку ён напісаў характарыстыку. І гэта не тыя нібы трафарэтныя паперкі, што звычайна атрымліваюць юнакі і дзяўчаты, пакідаючы школу, а сапраўдныя дэталёвыя партрэты. Яны змешчаны і ў кніжцы Д.А. Касценіча «Пра час і пра сябе». Вось некаторыя вытрымкі з характарыстык выпускнікоў 2008 года: «Малярэвіч Ірына – вельмі здольная дзяўчынка. Яна актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Ніводнае мерапрыемства не адбываецца без яе ўдзелу. Выдатны экскурсавод. А яшчэ памятаю, як пераканаўча прасіла Івана Фёдаравіча Каратыша, калі ён працаваў начальнікам аддзела адукацыі Барысаўскага райвыканкама, зрабіць двухсхільны дах Вяляціцкай школы. Быў нават прыдуманы яго спецыяльны макет. Іра ўзяла макет у рукі ў час правядзення экскурсіі для кіраўнікоў райсаветаў Мінскай вобласці і сказала: «Іван Фёдаравіч, паабяцайце, што дах будзе зроблены. Мы вельмі аб гэтым марым. Непрыемна, калі ў час дажджу за каўнер ліецца вада». «Вялікія начальнікі», якія былі на экскурсіі, такія спапяляючыя позіркі кінулі на Івана Фёдаравіча, што ён абняў Ірыну і сказаў: «Абяцаю: дах для Вяляціцкай школы мы абавязкова зробім». І слова стрымаў».

А вось яшчэ два запісы: «Паўлавец Міша. Унікальны хлопчык. Вельмі неспакойны, працавіты, сціплы і артыстычны. Прыроджаны артыст. На жаль, у нас няма спецыялістаў, каб развіваць талент Мішы. Гэта быў бы сапраўдны народны артыст. На 160-годдзе школы адбыўся сапраўдны бенефіс Мішы»; «Шэрая Алёна. Вельмі старанная дзяўчынка, але здольная на нестандартныя ўчынкі. Вельмі скрупулёзна вырашае матэматычныя задачы, а на перапынку гатова доўга весці дыскусіі з настаўнікам наконт таго, чаму ёй была пастаўлена менавіта такая ацэнка, а не больш высокая».

## Стварыць неба

Ёсць у Вяляцічах месца, куды нібы магнітам цягне дзяцей. Гэта – зорнае неба, створанае таксама па ініцыятыве Касценіча-старэйшага, захопленага астраноміяй, якую ён таксама выкладаў у школе. На вялікай пляцоўцы з камянёў (а іх у гэтай мясцовасці вельмі шмат), выкладзены самыя вядомыя нябесныя сузор'і, а пасярэдзіне – Палярная зорка. Менавіта тут Дзмітрый Аляксандравіч наладжвае вельмі папулярныя ў моладзі вечары фізікаў і лірыкаў. Юнакі і дзяўчаты расказваюць розныя гісторыі, чытаюць вершы, успамінаюць цудоўныя школьныя гады, тут іншы раз нараджаецца першае каханне.

Вельмі важна, што два небы – зорнае і зямное – заўсёды прываблiваюць былых выпускнікоў школы, для якіх вёска, малая радзіма не проста словы, а нешта вельмі значнае ў жыцці. І гэта цешыць душу заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, аднаго з прадстаўнікоў вялікай дынастыі педагогаў, якія пусцілі моцныя карані на беларускай зямлі, і становіцца лёгка на сэрцы. Значыць, яго праца мае плён...

**Віктар ЛОЎГАЧ,**
**Мінск – Вяляцічы – Мінск**